**Л.М.Рагачова**, *дацэнт*

# СІСТЭМНЫ ПАДЫХОД ДА РАСПРАЦОЎКІ І РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ СТАНДАРТАЎ У ГАЛІНЕ ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

У кантэксце задач, звязаных з вырашэннем праблем сацыяльна-эканамічнага, духоўнага развіцця грамадства, няўхільна ўзрастае ўзровень патрабаванняў да педагагічнай навукі і практыкі. Галоўным аб'ектам вывучэння ў іх з'яўляецца чалавек, які ўспрымаецца ў сучасным свеце як вышэйшая каштоўнасць, мера ўсіх рэчаў. У межах акрэсленай тэндэнцыі неабходныя пераарыентацыя ўсёй сістэмы адукацыі, выхавання на асобу, выяўленне сутнасных яе сіл, прызнанне за кожным права на адметнасць, непаўторнасць. Большая ўвага з боку адукацыйнай і выхаваўчай сістэм рэспублікі да ўнутранага свету асобы дазволіць сфарміраваць умовы для пабуджэння чалавека да самаразвіцця, таго, каб стаць творцай сябе і абставін, якія вызначаюць яго існаванне.

Рэформа сістэмы адукацыі значную ролю ў вырашэнні гэтай праблемы надае адукацыйным стандартам, што павінны забяспечыць аптымальныя ўмовы падрыхтоўкі спецыялістаў новай генерацыі, якія адпавядалі б сучасным міжнародным параметрам. Для гэтага, паводле меркавання вучоных, патрэбен прынцыпова іншы падыход да зместу, аб'ёму, складанасці, навуковасці вывучаемага матэрыялу. У час, калі запас ведаў і ўменняў асобы значна ўстарэвае ўжо ў першыя тры—пяць гадоў самастойнай працы, неабходна ў працэсе падрыхтоўкі спецыяліста ў вышэйшых навучальных установах вызначыць блок ведаў, што дазволіў бы паслядоўна, актыўна ўдасканальваць навыкі ў адпаведнасці са зменлівай сацыякультурнай сітуацыяй грамадскай практыкі.

Сучасны спецыяліст сферы вольнага часу — чалавек, які ўвасабляе дыялектычнае адзінства духоўных якасцей і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

высокага прафесіяналізму. Адзначаныя параметры выступаюць як два бакі аднаго медалю, цэлае і частка. Узаемасувязь іх забяспечвае ўзбагачэнне цэласнай асобы, таму што новаўтварэнні ў развіцці асобы вядуць да паглыблення і ўдасканалення прафесійнай дзейнасці, і наадварот. Агульнае ў развіцці асобы вызначаецца ў яе ўсебаковасці, гарманічнасці кампанентаў яе псіхалагічнай структуры. А прафесійнае звязана з працэсам самаідэнтыфікацыі з абранай сферай дзейнасці, глыбінёй і шырынёй ведаў і навыкаў, якія дазваляюць рэалізавацца ў канкрэтнай галіне, з агульнай культурай, светапоглядам, што фарміруюцца ў педагагічным працэсе падчас навучання ў вышэйшай навучальнай установе. Такім чынам, становіцца зразумела: фарміраванне асобы будучага спецыяліста патрабуе цэласнага падыходу, сістэмнасці ў канструяванні зместу адукацыі.

У структуры прадметнага зместу падрыхтоўкі кадраў для сферы культуры, мастацтва важнае месца займае цыкл псіхолага-педагагічных дысцыплін. Ад яго вывучэння залежаць прафесійнае мастацтва культуролага, магчымасці яго культурастваральнай дзейнасці як удзельніка сацыякультурнага працэсу. Гэта звязана з тым, што знаёмства з дысцыплінамі псіхолага-педагагічнага блока абумоўлівае стварэнне базавай асновы пранікнення ў псіхалагічны свет асобы, у спецыфіку яе станаўлення на розных узроставых этапах, у сацыяльных аб'яднаннях і відах дзейнасці.

Асэнсаванае ўспрыманне зместу псіхолага-педагагічнай дзейнасці, праламленне атрыманых ведаў праз прызму культуралагічнай дзейнасці ў ходзе навучання забяспечвае прафесійна-педагагічнае развіццё студэнтаў, фарміруе псіхолага-педагагічную культуру выпускнікоў вучэбнай установы. Асноўнымі кампанентамі такой культуры выступаюць:

— арганічнае адзінства псіхолага-педагагічных ведаў;
— актыўнае выяўленне іх у дзеяннях і зносінах;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— фарміраванне ўменняў самастойна атрымліваць веды, адаптаваць іх да прафесійнай дзейнасці.

Характарыстыка элементаў культуры спецыяліста-культуролага ў адзінстве ўяўляе сістэму, якая з'яўляецца важнай характарыстыкай атрыманых ведаў. Сістэмнасць азначае ўпарадкаванасць, паслядоўнасць і ўзаемасувязь элементаў, што маюць пэўную структурную арганізацыю. Яна ўяўляе своеасаблівую іерархію элементаў, робіць фарміраванне ведаў і навыкаў пераемным, лагічным. А для сістэмных аб'ектаў значныя не толькі сувязі і зносіны ўнутранага парадку, але і адзінства з асяроддзем, ва ўзаемасувязі з якім сістэма раскрывае сваю сутнасць і цэласнасць. Таму сістэмны падыход да распрацоўкі адукацыйных стандартаў у галіне псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі кадраў сферы вольнага часу з'яўляецца, на наш погляд, адным з базавых прынцыпаў.

Зыходзячы з акрэсленых характарыстык, сістэмнасць ведаў, атрыманых у працэсе вывучэння псіхолага-педагагічных дысцыплін, павінна ўключаць не столькі аб'ёмнасць іх (што пры сучасных тэмпах развіцця ведаў становіцца немагчымым), колькі забяспечваць разуменне логікі іх развіцця, рэалізацыі ў практычнай дзейнасці. Такім чынам, прафесійная падрыхтоўка спецыяліста павінна быць арыентавана не на колькасныя параметры, а на стварэнне ў студэнтаў сістэмы ведаў, развіццё культуры мыслення, дзеля таго каб сфарміраваць у іх здольнасць да ацэнкі фактаў, з'яў, ідэй, з якімі тым давядзецца мець справу ў практычнай дзейнасці. Студэнт павінен быць падрыхтаваны да ўспрымання, адбору, выкарыстання ведаў. Без успрымання ведаў у цэласным сістэмным выглядзе вынікі працы культуролага будуць мець мазаічны, разрознены, спантанны характар. Гэта негатыўна паўплывае на развіццё, культурны рост насельніцтва.

Аналіз практыкі псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў, што склалася ва ўніверсітэце, дазваляе сцвярджаць: асноўныя кампаненты ведаў, вывучаемых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнтамі на розных курсах, уяўляюць адзіную сістэму. Асабліва гэта тычыцца знешніх параметраў сістэмнага навучання. Так, агульная псіхалогія, з якой пачынаецца вывучэнне псіхолага-педагагічных дысцыплін, з'яўляецца тэарэтычным фундаментам, на які ў далейшым абапіраюцца выкладчыкі, студэнты пры знаёмстве з узроставай і педагагічнай псіхалогіяй, сацыяльнай псіхалогіяй, псіхалогіяй мастацкай творчасці, педагогікай і прыватнымі методыкамі. Менавіта асновы агульнай псіхалогіі складаюць тое ядро, што забяспечвае навуковасць, цэласнасць успрымання і засваення курса псіхолага-педагагічных навук.

У акрэсленай паслядоўнасці адбываецца пераход ад лінейнага выкладання і ўспрымання ведаў да канцэнтраванага, калі набытыя ў курсе агульнай псіхалогіі паняцці, законы асэнсоўваюцца студэнтамі ў прымяненні да розных абставін ці ўзроставага характару, ці віду дзейнасці, формы і спосабу зносін, педагагічнага ўзаемадзеяння. У выніку ў свядомасці студэнтаў адбываецца пераўтварэнне лінейных сувязей паміж асобнымі раздзеламі, прадметамі псіхолага-педагагічнага блока ў аб'ёмныя, калі фарміруюцца ўзаемапранікальныя і ўзаемадапаўняльныя сувязі паміж рознымі блокамі ведаў, з аднаго боку, і мадэліруецца карціна магчымай рэалізацыі гэтых ведаў у практычнай дзейнасці, з другога. Такім чынам, ажыццяўляюцца як стварэнне сувязей і зносін паміж элементамі ведаў, так і ўзаемадзеянне іх з наваколлем, што набліжае да сістэмнасці ў засваенні вучэбнага матэрыялу.

Бясспрэчнай умовай прадуктыўнасці такой сістэмы ўспрымання і асэнсавання ведаў з'яўляецца ўлік профілю падрыхтоўкі спецыялістаў, іх спецыялізацыі. Гэта станоўча адбіваецца на псіхолага-педагагічнай і прафесійнай культуры выпускнікоў.

Вопыт работы вышэйшых навучальных устаноў, і універсітэта культуры ў тым ліку, сведчыць аб тым, што важным элементам замацавання сістэмнага падыходу ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

засваенні ведаў павінна стаць іх практычнае засваенне студэнтамі ў рэальных дзеяннях і зносінах. Гэты этап звязаны з набыццём умення дзейнічаць на падставе атрыманых ведаў. Ён прадугледжвае вылучэнне ў навучальным працэсе такіх формаў работы, як:

— правядзенне практычных і семінарскіх заняткаў з мадэліраваннем канкрэтных сітуацый;

— далучэнне студэнтаў да навукова-даследчай дзейнасці;

— абавязковае праходжанне практыкі з выкананнем асобных заданняў.

Гэтыя віды заняткаў дазваляюць ажыццявіць перанос і камбінаванне ведаў у адпаведнасці з нестандартнымі жыццёвымі абставінамі, што з'яўляецца важнай умовай фарміравання прафесійных навыкаў будучых спецыялістаў.

Аднак на практыцы ў студэнтаў склаўся стэрэатып спажывецкіх адносін да набыцця інфармацыі. Неабходна па-іншаму падыходзіць да распрацоўкі зместу адукацыі, размеркавання долі вучэбных гадзін на практычную дзейнасць — калі ў працэсе выпрацоўкі самастойнага падыходу да культуралагічнай з'явы ў студэнтаў на падставе пошуку, перапрацоўкі даных псіхолага-педагагічных і культуралагічных навук вымалёўваецца ўнутраная схема дзейнасці, развіцця канкрэтнага культуралагічнага аб'екта.

Найбольш сістэмна гэты падыход студэнты могуць ажыццявіць у працэсе эксперыментальнай навукова-даследчай работы, да якой далучаюцца ўсе навучэнцы ў працэсе напісання курсавых работ па педагогіцы. На падставе атрыманых ведаў у ходзе правядзення даследавання студэнты вучацца ўяўляць і фарміраваць педагагічныя мэты, задачы, прагназіраваць ход іх вырашэння ў агульным выглядзе і ў асобных сітуацыях, знаходзіць аптымальны варыянт вырашэння, асэнсоўваць і аналізаваць вынікі. Пры навуковым даследаванні ажыццяўляецца набыццё ўмення вывучаць псіхалагічны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стан выхаванцаў, педагагічнага, культуралагічнага персаналу, аналізаваць узровень развіцця культурна-выхаваўчага асяроддзя, асобных яго кампанентаў, ацэньваць метадычнае забеспячэнне працы педагагічнага калектыву, абагульняць і распаўсюджваць перадавы вопыт.

На распрацоўку гэтага ўмення павінна быць накіравана педагагічная практыка студэнтаў. Яна не толькі замацоўвае веды, але і дае магчымасць выявіць творчы падыход да вырашэння практычных задач. А гэта з'яўляецца завяршальным этапам сістэмнага засваення дысцыплін псіхолага-педагагічнага цыкла.

Разгледжаныя аспекты падрыхтоўкі спецыялістаў даюць падставы сцвярджаць: у адукацыйныя стандарты неабходна закласці трывалую аснову ўспрымання ведаў і навыкаў. Яна дазволіць творча падысці да вырашэння надзённых сацыякультурных праблем.

**Р.А.Ровіна, В.А.Касап,** *дацэнты*

## МЕСЦА І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫКЛАДАННЯ ГАЛІНОВЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ КУРСАЎ ВА ЎМОВАХ СТАНДАРТЫЗАЦЫІ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Бібліяграфічная падрыхтоўка студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў з'яўляецца састаўной часткай агульнапрафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў. У спецыяльным друку перыядычна праходзяць дыскусіі наконт удасканалення бібліяграфічнай падрыхтоўкі студэнтаў. Так, вядомыя дыскусіі адбываліся ў канцы 70-х гадоў у сувязі з выхадам манаграфіі А.П.Коршунава, у другой палове 80-х гадоў вакол перабудовы вышэйшай бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі, у пачатку і ў другой палове 90-х гадоў яны былі звязаны з распрацоўкай у Расіі, іншых краінах СНД адукацыйных стандартаў. У іх бралі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ